**ПРЫКМЕ́ТЫ**, жанравая разнавіднасць малой фальк. прозы, пад якой разумеецца прадказанне пэўнага выніку, заснаванае на аб'ектыўнай заканамернасці і прычынна-выніковай залежнасці з'яў, падзей, дзеянняў, і пацверджанае многавяковым нар. вопытам. П. паведамляюць пра характар будучага надвор'я, асаблівасці чаканага ўраджаю, фізічны стан чалавека і жывёл і г.д. Увабраўшы ў сябе назіральнасць і мудрасць народа, вопыт многіх пакаленняў, П. часта выступаюць надзейнымі памочнікамі ў жыцці і працы. Яны дазваляюць чалавеку рацыянальна размеркаваць свае заняткі, своечасова правесці гаспадарчыя работы, па магчымасці засцерагчы сябе і сваю гаспадарку ад нечаканасцей прыродных стыхій. Як аб'ектыўныя паказчыкі будучага П. засноўваліся на разнастайных фактарах навакольнага свету: атмасферных з'явах — тумане, расе, агні, дыме («Калі дым з коміна ідзе проста ў гору — на пагоду»); нябесных свяцілах («Ясная поўня паказвае на яснае надвор'е да самага маладзіка», «Сонца садзіцца ў хмары — заўтра будзе дождж»); асаблівасцях росту раслін — дрэў, кустоў, кветак, травы; паводзінах дзікіх і свойскіх жывёл і птушак, паўзуноў, земнаводных, рыб, насякомых («Ластаўкі пырхаюць над вадою — на дождж», «Мурашы хаваюцца ў мурашнік — чакай дажджу»). Нярэдка селянін абапіраўся на канкрэтныя дні календара і звязаныя з ім імёны пэўных святых («Сей агуркі, калі Пахом, — збярэш мяхом», «Бусел прыляціць перад Благавешчаннем — год будзе ўрадлівы»). П. бытавалі ў вуснай форме, нярэдка захоўваліся ў памяці дзякуючы дакладна знойдзенаму моўна-вобразнаму афармленню. Выкарыстанне ў афарыстычных фразах рыфмы, трапных нар. вобразаў часта набліжала П. да *прыказак* і *прымавак*. У выпадках, калі ў прадказаннях прычынна-выніковая сувязь парушаецца і яе падмяняе выдумка, такія сцвярджэнні кваліфікуюцца не як П., а як *павер'і*, хоць у народзе гэтыя паняцці часам не адрозніваюцца.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996; Тое ж. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998; Тое ж. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ